**Мерапрыемства, прысвечанае**
**Міжнароднаму дню роднай мовы**

*Якія знаёмыя назвы і словы,*
*Якая цудоўная родная мова!*
*І ўсё мілагучна для слыху майго:*
*І звонкае "дзе" і густое "чаго"...*
*Пімен Панчанка*

- Добры дзень, паважаныя госці і навучэнцы. Рада вітаць вас на нашым мерапрыемстве, якое прысвечана Міжнароднаму дню роднай мовы і адзначаецца 21 лютага.

**Мэта:** замацоўваць веды навучэнцаў аб мове, аб багацці і разнастайнасці моўных сродкаў; развіваць ўменне працаваць у групе і лагічна мысліць, разважаць; ствараць умовы для выхавання павагі і пачуцця любові да роднай мовы, роднай прыроды, радзімы.

**Выкладчык:**

Пагавары са мной на мове,

На нашай роднай, не чужой.

Адчуеш ты – у кожным слове

Душа яднаецца з душой.

І сэрца сэрцу адкрывае

Свае духоўныя сады –

Там салаўіны хор спявае,

Там смак крынічнае вады.

Там рэха продкаў прамаўляе

Малітвы светлыя здалёк,

Нібыта нас благаслаўляе

На добры шлях, на лёгкі крок.

У словах тых – надзеі нашы,

І нашы мары пра жыццё.

Калі мы з мовай – нас не страшыць

Ні гвалт, ні мор, ні забыццё.

…Пагавары са мной на мове,

Забудзь на час пра "языкі".

Няхай гучаць у кожным слове

І продкі нашы, і вякі!

**Выкладчык:**

21 лютага ў свеце адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы. Ён быў абвешчаны ЮНЕСКА. З прапановай увесці такі дзень выступіў Бангладэш, дзе 21 лютага 1957 года, адстойваючы права вучыцца на роднай мове, загінулі пяць студэнтаў. Трэба адзначыць, што сярод 25 суаўтараў рэзалюцыі ЮНЕСКА аб гэтым свяце была і Беларусь.

Сёння у нашым рознакаляровым і рознагалосым свеце налічваецца больш за шэсць тысяч моваў. Палова з іх знаходзіцца пад пагрозай знікнення. Менавіта дзеля іх захавання і быў абвешчаны Дзень роднай мовы.

Гэта свята – нагода для носьбітаў любой мовы яшчэ раз задумацца аб лёсе той, адзінай, якую мы завём матчынай, на якой думаем, на якой вымавілі першае слова і на якой размаўлялі нашы продкі.

Няхай сёння родная мова моцная, распаўсюджаная, абароненая заканадаўствам, але няма гарантыі, што ўжо заўтра яна не трапіць у спіс тых трох тысяч, гатовых знікнуць. Сярод якіх, на жаль, знаходзіцца і наша мова.

Беларуская мова прайшла доўгі гістарычны шлях, на якім былі як часы росквіту, так і часы заняпаду. Былі нават такія перыяды, калі яна ледзь не знікла. Нашы бацькі, дзяды і прадзеды нямала зрабілі, каб беларуская мова была прызнаная як роўная сярод іншых моў свету.

Будзь жа разам з тымі, хто думае пра яе будучыню. Размаўляй па-беларуску, бо заўтра наша мова табе, тваім дзецям і ўнукам стане неабходнай. І не саромейся недасканалай гаворкі. Мова – жывая існасць, якая жыве там, дзе ёсць людское жаданне. Ведай: учора ты яшчэ не гаварыў па-беларуску, сёння размаўляеш на «трасянцы», а заўтра будзеш гаварыць на чыстай літаратурнай мове. А дзеля пачатку дастаткова зусім мала – проста паспрабаваць адзіны дзень у год, напрыклад, 21 лютага, з калегамі, сябрамі, роднымі, размаўляць па-беларуску.

А зараз паслухайце словы Змітрака Бядулі

- “Не саромся, беларус, гаманіць па-свойму — на роднай мове бацькоў і дзядоў сваіх. Шануй сваю мову, шануй свае песні, свае казкі, звычаі і ўсё роднае — гэта спадчына дзядоў і вялікі нацыянальны скарб. Толькі тады цябе ўсе будуць шанаваць як чалавека, калі сам сябе будзеш шанаваць — калі не адкінеш свайго нацыянальнага ўласнага багацця. А першы скарб нацыянальны — гэта родная мова”.

**Навучэнец 1:** У кожнага чалавека, дзе б ён не жыў, ёсць родная мова, якая нястомна служыць у розных яго занятках і патрэбах. Сіла і краса народнага слова – заканамерны вынік моватворчай дзейнасці народа. Нашы продкі тонка адчувалі слова, умелі зазірнуць у яго глыбіні.

**Навучэнец 2:** Кожны знас – своеасаблівая і непаўторная індывідуальнасць, хоць , здаецца, існуе шмат падобных людзей. І ўсё-такі знешнасць, пастава, манера апранацца ў кожнага свая, тое ж самае можна сказаць пра нашу мову і маўленне. І сапраўды, наша слова выяўляе тое, што схавана глыбока ў думках, душы і сэрцы. А зараз паслухайце верш Сяргея Грахоўскага “Словы”

**Навучэнец 3:**
Над намі словы уладарaць.
Мы чуем і гаворым іх.
Яны то здружаць, то пасвараць
Сяброў і ворагаў маіх.

Бо словы розныя бываюць.
Адны — агню стрымаюць шквал,
Другія словы забіваюць
Усё жывое напавал.

Ад слова сэрца халадзее,
Праходзяць сон і забыццё,
Ад слова рушацца надзеі,
Ад слова свеціцца жыццё.

Ад слова вырастаюць крылы,
А ў сэрца стукае любоў,
Ад слова прыбываюць сілы,
Дык не шкадуйце шчырых слоў!

А здатным толькі на дакоры
І гучна словамі грымець,
Каб не прыносіць людзям гора,
Было б найлепей анямець.

**Выкладчык:** Слоў бясконца многа, яны ўсюды, яны на кожным кроку: я чытаю кнігу – словы, слухаю радыё – словы, сустракаюся зсябрам – словы, сяджу на сходз – словы, моўчкі іду на работу – словы.

**Навучэнец: …** Слова – багацце ні з чым не параўнанае, багацце, якое здабываецца ў пакутах, а аддаецца за дарма. Слова не трымаецц ў сакрэце, яно- сад, адкрыты для ўсіх: заходзь і бяры ў ім што хочашь, на выбар, што па густу – узбагачайся на самае дарагое, што ёсць у жыцці чалавека…
**Навучэнец: …** Слова выяўляе таямніцы розуму і сэрца. Слова раскрывае лад думак чалавека. Слова сведчыць аб тым, якая сіла, добрая ці злая, жыве ў чалавечай душы. Калі слова ліслівае, просякнута духам ганарлівасці, прыкрасці ці зласлівасці, калі слова прасякнута атрутай асуджэння, то якое ж сэрца такога чалавека? А як непрыемна чуць нецэнзурныя словы, якія ўжывае і моладзь, і людзі больш сталага ўзросту. І наадварот, калі мы чуем слова праўдзівае і яснае, добае і бадзёрае, суцяшальнае і прыветлівае, то з такім чалавекам нам заўсёды прыемна мець зносіны.
**Выкладчык: Паслухайце, калі ласка два сачыненн**

**Навучэнец: Не брыдкаслоўце!**

У нашай мове многа розных слоў: ласкавых, добрых, вяселых. Але ці толькі такія словы мы чуем? Не. Часта мы чуем і брыдкія словы, ад якіх становіцца сорамна.

У наш час культура маўлення пакідае жадаць лепшага. Але чаму так? Чаму вельмі часта мы чуем нецэнзурныя словы? Яны ўвайшлі ва ўжытак, і іх можна пачуць на дыскатэцы, на вуліцы і нават у школе. Мне здаецца, што многія маладыя людзі не хочуць быць белай варонай. "Раз сябры брыдкасловяць, то буду і я", - думаюць яны.

Праблема культуры маўлення сённявельмі актуальная. Я ведаю, што за ўжыванне нецэнзурных слоў у грамадскіх месцах паграджае штраф, але не разу нідзе не чытаў, ні ад каго не чуў, каб пакаралі хаця б аднаго чалавека. Я ўпэўнены, што трэбы выцясняць з ужытку нецэнзурныя словы, трэба рабіці заўвагі тым, ад каго іх чуеш. Зчалавекам, які брыдкасловіць, не хочацца размаўляць, бо яго мова рэжа слых.

Якімі вы хочаце быць: культурнымі людзьмі ці неахайнымі ў сваім маўленні? Выбар за вамі.

**Навучэнец: Ветлівыя словы**

Якія прыгожыя родныя словы! Якой пяшчотай і цеплыней ад іх вее. Яны запаўняюць ўсё навокалнечым незразумелым, але такім жаданым і непаўторным. Я лічу нашу мову прыгожай, самай пяшчотная, пявучай, вобразнай, шчырай. Шмат у ёй розных ветлівых зваротаў, такіх як " калі ласка", "дзякуй". Гэтыя словы называюць чароўнымі. Яны упрыгожваюць наша маўленне, яны выклікаюць добры настрой. Здапамогай такіх слоў можна пазбегнуць любых канфліктаў. Пятрусь Броўка пісаў:

У любімай мове, роднай, наскай,
Ах, якія словы: "Калі ласка!.."
Як звіняць яны сардэчнаю струною,
Праз усё жыццё ідуць са мною.

Хочацца, каб часцей гучала наша "калі ласка", бо слова роднае, як і думку, ніштo не можа стрымаць і абмежаваць.

**Выкладчык:** А зараз пераходзім да гульні.

**Гульня "А ці ведаеце вы беларускую мову"**

Гульня складаецца з трох тураў і фіналу. У гульне ўдзельнічае тры каманды 1-га курса :35, 36, 37. У кожным туры будуць задавацца пытанні, перамагае той, хто хутчэй і правільна будзе даваць адказы на іх.

А зараз, каб пачаць наша спаборніцтва я прадстаўлю наша шаноўнае журы:

Правіла гульні: Задаецца пытанне і чыя каманда першая падымае руку і адказвае правільна, зарабляе бал. А той, хто скажа адказ не падняўшы руку , гэтай камандзе адказ залічаны не будзе.

Журы мы прадставілі, з правіламі пазнаёміліся, а зараз пачынаем. Усім поспехаў!

## Ход гульні

## 1 тур “Беларуская мова”

**1. Дзень роднай мовы, згодна з рашэннем ЮНЕСКА, штогод адзначаецца:**

*а) 21 лютага;*
б) 20 сакавіка;
в) 19 чэрвеня;
г) 15 верасня.

**2. Павага, пашана, гонар, чэсць, аўтарытэт, рэпутацыя— гэта:**

а) амонімы;
б) паронімы;
*в) сінонімы;*
г) антонімы.

3. **Падпарадкавальнай сувяззю “дапасаванне” звязаны словы ў словазлучэнні:**

а) пісаць ліст;
*б) цікавая кніга;*
в) цікавіцца падзеямі;
г) паведамляць аб навінах.

**4. У беларускай мове не існуе нормы:**

а) лексічнай;
*б) фанетычнай;*
в) стылістычнай;
г) пунктуацыйнай.

**5. Словам, якое не ўтворана прыставачна-постфіксальным спосабам, з’яўляецца:**

а) нагасцявацца;
*б) скупіцца;*
в) нацярпецца;
г) раскрычацца.

**6.** ***На ўсю іванаўскую.*** **Гэта як?**

а) Павольна;
б) вельмі ціха;
в) абы-як;
*г) вельмі гучна(голасна).*

**7.** ***Маці сёння не спіцца.*** **Гэта сказ:**

а) няпэўна-асабовы;
б) пэўна-асабовы;
в) двухсастаўны;
*г) безасабовы.*

**8. Якая норма мовы прадугледжвае правільную пастаноўку націску?**

а) Лексічная;
б) сінтаксічная;
*в) акцэнталагічная;*
г) арфаэпічная.

**9. Да мужчынскага роду належыць назоўнік:**

а) асарці;
б) івасі;
в) бюро;
*г) какаду.*

**10. Раздел мовы, які вывучае паходжанне і гісторыю асобных слоў, называецца:**

*а) этымалогія;*
б) анамастыка;
в) семасіялогія;
г) фаналогія.

## 2 тур

**1 заданне.**
З дадзеных літар складзіце слова
ГРАМАТЫКА

**2 заданне.**
Студзень, люты, сакавік, красавік, май, чэрвень, ліпень, жнівень, верасень, кастрычнік, лістапад,снежань.

**3 заданне.**
Кош, ліпа, шашка, рака, кот.

**4 заданне.**
Буква, буквар, рака, крынка, рынак, рука, ранак і інш.

## 3 тур

1. **– гбва**
2. **- вабг**
3. **– вагб**
4. **- габв**
5. **- вагб**

## ФІНАЛ

1. **Мак – рак**
2. **Грыб – грып**
3. **Дом – дым**
4. **Бетон  - батон**
5. **Колас – голас**

**Падвядзенне вынікаў**

**Дзякуй за ўвагу**

А скончыць мне хацелася вершам пра Беларусь.

Усяму вядомы свету
Наш руплівы край здавён.
Тут на сонечных палетках
Спеюць бульба, жыта, лён...

Тут Дняпро бяжыць прывольна,
Сож, Бярэзіна, Дзвіна,
Прыпяць, Шчара, Свіслач, Неман,
Вілля, Піна, Буг, Дзісна...

Тут крыштальныя азёры —
Нарач, Свіцязь, Снуды, Свір.
Полацк — наш найпершы горад,
Віцебск, Тураў, Кобрын, Мір...

Тут сыны ляцяць у космас,
Песні матчыны пяюць...
Гэты край наш найдзівосны
Беларуссю ўсе завуць.

# АДКАЗЫ

## 1 ТУР

1. **А**
2. **В**
3. **Б**
4. **Б**
5. **Б**
6. **Г**
7. **Г**
8. **В**
9. **Г**
10. **А**

### 2 тур

**1 заданне.**
З дадзеных літар складзіце слова
ГРАМАТЫКА

**2 заданне.**
Студзень, люты, сакавік, красавік, май, чэрвень, ліпень, жнівень, верасень, кастрычнік, лістапад,снежань.

**3 заданне.**
Кош, ліпа, шашка, рака, кот.
**4 заданне.**
Буква, буквар, рака, крынка, рынак, рука, ранак і інш.

### 3 тур

**6. – гбва**
**7. - вабг**
**8. – вагб**
**9. - габв**
**10.- вагб**

### ФІНАЛ

**6. Мак – рак**
**7. Грыб – грып**
**8. Дом – дым**
**9. Бетон - батон**
**10.Колас – голас**